Cana 10 hr. | Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 14 (655). | Wilnia, Niadziela 29 Sakawika 1936 h. | Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Padpiska u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

ЗА РОДНУЮ ШКОЛУ!

Сёлетні год беларускае грамадзянства пасьвячае справе сваей роднай беларускай школы. З гэтай нагоды варта прыпомніць, хоць збольшага, што для гэтай справы рабілі беларусы ў мінуўшчыне і што яны робяць ды што рабіць павінны сяньня.

Справа беларускай школы ня новая. Яна больш-менш зьвязана з пачаткамі беларускага адраджэньня. Ужо першыя нашы культурныя і палітычныя працаўнікі забіралі голас аб беларускай школе, выдавалі адпаведныя беларускія чытанкі для дзяцей, даказвалі патрэбу для беларусаў іх роднай школы, а так-жа будзілі ў цёмных, сонных беларускіх масах зразуменьне важнасьці сваей школы і яе жаданьне.

Гэтыя агульныя яшчэ, толькі тэорэтычныя, беларускія імкненьні да роднай школы, пачынаючы ад 1905-6 году, ужо пакрысе ставаліся фактам, нязначна ўваходзілі ў жыцьцё. Так напр. у гэтым часе беларусы-вучыцялі пад кіраўніцтвам цяперашняга вялікага беларускага народнага паэта Якуба Коласа тайком ад вока царскай паліцыі сям-там вучылі беларускіх дзетак у іх роднай мове.

Падчас вайны (1915—17), на беларускіх землях, занятых нямецкім войскам, беларускіх школ ужо існавала нешта да 150. У гэтым часе ўжо існавала й беларуская вучыцельская сэмінарыя ў Сьвіслачы.

Пасьля нямецкай акупацыі, падчас улады на звольненых немцамі беларускіх землях „Zarządu Ziem Wschodnich" так-жа існавалі яшчэ дзесяткі беларускіх школ.

Існавалі беларускія школы і былі пачаўшы буйна разьвівацца падчас улады на тых-жа землях «Сярэдняй Літвы». У гэным часе беларускіх школ налічалася нешта каля 200.

Калі-ж у 1921 г. усталілася граніца між Польшчай і Саветамі, справа беларускай школы так-жа не заглохла, хоць лёс яе быў і ёсьць цяпер часта цяжкі і рознаякі. У Беларусі Усходняй, што асталася пад Саветамі, беларуская школа, агулам гаворачы, здабыла сабе права грамадзянства. Недахват там аднак гэтай школы ў тым, што ідэова яна пабудавана аднабока, выключна на прынцыпе матар'ялізму і бязбожнасьці. У Заходняй Беларусі, што адыйшла пад Польшч, беларуская школа павомі пачала замірацць і ўрэшце бадай замёрла сусім. Замёрла яна затым, што напаткала на сваей падарожы, незалежныя ад сябе, перашкоды, перамагчы якіх ёй было неўмагату.

Народ аднак беларускі, разам з сваей інтэлігенцыяй, аб патрэбе беларускай школы і тут не забываўся. Так напр. пасьля 1924 г. беларусы згодна з так зв. «ustawami językowemi» (31.VII.24) падалі польскім уладам дэклярацыяў на 412 беларускіх школ. Пасьля гэтага беларусы яшчэ раз — так-жа падавалі многа дэклярацыяў.

Тымчасам у польскіх газэтах пачалі штораз часьцей паяўляцца галасы, што беларусы ня маюць сваей школы, бо яе ня хочуць. Ясна, беларускія газэты пярэчылі гэтаму, але справе школы гэтым, на жаль, не маглі памагчы нічога.

Урэшце аб гэтым летась у лістападзе месяцы, сказаў сваё слова і Куратар Віленскага Школьнага Вокругу. Пасьля слоў Куратара беларускае грамадзянства пастанавіла яшчэ раз выявіць волю пажаданьня роднай школы.

Між беларусамі розных кірункаў пачаліся ажыўленыя нарады аб справе роднай школы. У выніку гэтых нарадаў сярод беларусаў паўстаў супольны школьны фронт, заданьнем якога — барацьба за родную беларускую школу. Барацьбе гэтай пасьвячаецца ўвесь сёлетні год. Існуе ўжо патрэбная для гэтай акцыі літаратура: адозвы, плякаты, дэклярацыі, інструкцыі. Пачалася ўжо і праца.

Дык натужма-ж усе нашы беларускія сілы, каб супольна бароцца за сьвятую справу роднай беларускай школы! Супольнымі сіламі да супольнай працы!

Аб працы сваей на беларускім школьным фронце, аб перашкодах, аб выніках і г. д., словам, аб усім, паведамляйце беларускі школьны сакратарыят: Вільня, Каралеўская: 3—8. Гэты-ж сакратарыят на жаданьне бясплатна высылае ўсе патрэбныя друкі.

УВАГА! Да гэтага нумару „Бел. Крыніцы" далучаем дадатак—часапіс для бел. дзетак „ПРАЛЕСКІ", а так-жа „Інструкцыю, як дамагацца беларускай школы".

Сябром Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, Сябром Беларускага Народнага Аб'еднаньня і ўсяму беларускаму грамадзянству.

Камунікат № 2.

Прэзыдыюм Цэнтральнага Камітэту Беларускага Народнага Аб'еднаньня, разглядзеўшы пісьмы, адрасаваныя сьпярша ў ЦК-БХД, пасьля ў Цэнтральны Камітэт Беларускага Народнага Аб'еднаньня, а так-жа ў рэдакцыю „Беларускай Крыніцы", з дамаганьнем супрацоўніцтва БНА з КПЗБ і ўтварэньня з гэтай апошняй супольнага супроць-фашыстаўскага народнага фронту, а так-жа з закідамі, што быццам БХД БНА творыць блёк з польскай санацыяй, а нават мае зносіны з нямецкімі гітлераўцамі і японцамі, — пастанавіў падаць да ведама аўторам гэтых пісьмаў — сябрам КПЗБ, а так-жа сябрам і прыхільнікам БНА і ўсяму беларускаму грамадзянству наступнае:

Прэзыдыюм Цэнтральнага Камітэту Беларускага Народнага Аб'еднаньня сьцьвярджае, што БНА вядзе далей незалежніцкую палітыку, якой трымалася Бел. Хр. Дэмократыя і што БХД свае адносіны да КПЗБ выказала камунікатам з дня 25 верасьня 1935 г., каторы прынцыпова прыняла і пацьвердзіла Рада БХД-БНА на сходзе дня 26.I.1936 г.

Прэзыдыюм Цэнтральнага Камітэту БНА сьцьвярджае так-жа, што БНА ня ўхіляецца ад супрацоўніцтва з беларускімі арганізацыямі, якія імкнуцца зьдзейсьніць постуляты беларускае нацыянальна-вызваленчае думкі, імкнуцца да асягненьня палітычнага ідэалу Беларускага народу— да самастойнасьці ягонай на ўсіх этнографічна-беларускіх землях, аб'еднаных у незалежную дзяржаву.

БНА, імкнучыся да палепшаньня палажэньня Беларускага народу на ўсіх яго землях і гэтак рэалізуючы сваю праграму і ідэолёгічную плятформу, — паўтараем, — не адкідае, а дэкляруе супрацоўніцтва з тымі арганізацыямі і партыямі, якія бароняць і імкнуцца заспакоіць інтарэсы Беларускага народу, прызнаючы яго постуляты нацыянальна-палітычныя, культурныя і соцыяльна-эканамічныя.

Прэзыдыюм Цэнтр. Камітэту БНА ад імя цэлай арганізацыі заяўляе, што адкідае дамаганьні супрацоўніцтва з КПЗБ і ўтварэньня з ёй супольнага супроцьфашыстаўскага народнага фронту дзеля гэткіх прычын:

1. КПЗБ зьяўляецца партыяй інтэрнацыянальнай і цалком залежнай, пасрэдна праз Польскую Камуністычную Партыю, ад Камінтэрну;
2. КПЗБ пашырае сярод Беларускага народу ідэолёгію супярэчную з вызвольнымі народна-соцыяльнымі імкненьнямі БНА, выражанымі ў ейнай праграме;
3. КПЗБ, выступаючы супроць дыктатуры буржуазна-фашыстаўскай, прызнае і падтрымлівае пануючую цяпер над Беларускім народам у Савецкай Беларусі дыктатуру пролетарыяту: БНА проціў усякай дыктатуры, а гэтым самым і проціў пануючай цяпер дыктатуры пролетарыяту ў Савецкай Беларусі.

Апрача гэтага, КПЗБ ёсьць арганізацыяй нелегальнай, тайнай і няведама якія людзі ў ёй дзеюць. Дык супрацоўніцтва яўна-дзеючай арганізацыі БНА з нелегальнай і тайнай партыяй КПЗБ, для БНА было-б самаправакацыяй і зьнішчэньнем самой сябе.

Прэзыдыюм ЦК-БНА, ад імя цэлай арганізацыі заяўляе так-жа, што ані сьпярша БХД, ані цяпер БНА ніякіх перагавораў з польскай санацыяй або іншымі польскімі групамі аб утварэньні польска-беларускага блёку не вяло і не вядзе, а так-жа ня было і няма ніякіх перагавораў або дагавораў нашай арганізацыі з нямецкімі гітлераўцамі або японцамі.

Прэзыдыюм Цэнтральнага Камітэту БНА заклікае сяброў БНА дастасавацца да сказанага ў Камунікаце і ў парадку арганізацыйнай дысцыпліны наказвае ня ўходзіць у ніякія сувязі з КПЗБ. Адначасна Прэзыдыюм ЦК БНА прыпамінае сябром БНА аб іх абавязках працы ў граніцах праграмы і статуту БНА.

Прэзыдыюм ЦК-БНА ўрэшце зварочвае ўвагу ўсяго беларускага грамадзянства на сучаснае палажэньне Беларускага народу, на патрэбу консолідацыі беларускіх нацыянальных сіл і працы на карысьць Бацькаўшчыны

ПРЭЗЫДЫЮМ
Ц. К-ТУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА АБ'ЕДНАНЬНЯ

(—) *Я. Пазьняк*, Старшыня
(—) *Др. Ст. Грынкевіч*, І-шы Віцэ-Старшыня
(—) *М. Дварэцкі*, ІІ-гі Віцэ-Старшыня
(—) *Інж. А. Клімовіч*, Скарбнік
(—) *Я. Найдзюк*, Сакратар.

Вільня, 20 сакавіка 1936 г.

Чарговы палітычны працэс у Вільні

Судзяць беларусаў, якія гуртаваліся каля „Бел. Газэты" і „Асвы".

23 сакавіка сёлета пачаўся ў Віленскім Акружным Судзе палітычны працэс, які, магчыма, працягнецца некалькі дзён.

Абвінавачаныя: 1) Ян Міска, 25 гадоў, 2) Діна Мадэйскер, 19 гадоў, 3) Іцка Потажнік, 21 год, 4) Фрэйда Будовіч, 18 г. 5) Валенты Таўлай, 22 г., 6) Александар Карповіч, 30 г., 7) Алена Буднік, 36 г., 8) Пётр Радзюк, 23 г., 9) Ян Патаповіч, 25 г., 10) Алексы Рэдзька, 30 г., 11) Піліп Пестрак, 33 г. — Усе знаходзяцца пад арыштам і ў суд прывозяць іх з вастрогу. З волі зьяўляюцца ў суд: 12) Тодар Кудзіновіч, 29 г., 13) Люба Кудзіновіч, 26 г., 14) Іван Тімофеев, 29 г., 15) Разаля Крыштопаніс, 45 г. і 16) Сабіна Вішнеўская, 43 г. Акт абвінавачаньня закідае ўсім падсудным супрацоўніцтва з КПЗБ. З выясьненьняў жа абвінавачаных выглядае, што „Бел. Газэта" і „Асва" мелі найгалаўнейшае заданьне — барацьбу з іншымі беларускімі кірункамі, а галоўна—з Бел. Хрысьц. Дэмократыяй.

Шырэй гэты працэс апішам у наступным нумары.

240364

25 sakawik 1918-1936.

Ja, što pišu heta, uściaž hladžu na słaŭnuju ŭ nas historyju 25 sakawika. Wialikuju roźnicu pamiž hodam 1918 i 1936 siahońnia my bačym usie. 25 sakawik u 1918 hodzie suliŭ biełarusam ščaście. Treba było tolki mocnaj ruki, kab chapić hena ščaście i adpawiedna jaho wykarystać. Hena ščaście, jak zaŭsiody na świecie, wymahała ad biełarusaŭ wialikaj achwiary, złučanych siłaŭ usiaho narodu. Ale tady biełarusy nia zdoleli jašče apiorcisia na swaje ŭłasnyja siły. Jany lišnie ŭpilisia nadziejami, jakija im z prawa i lewa padsoŭwali ich susiedzi. Jany ciešyli biełarusaŭ tady abiecankami, samych siabie na biełaruski košt uzmacniajučy. Wir čužych siłaŭ u henym časie na Biełarusi skruciŭ, zmuciŭ i ŭtapiŭ u sabie niezaležnaść Biełarusi. Tak tady biełaruski narod i nie zrealizawaŭ swaich ideałaŭ.

Ale prachodzili hady. Z kožnym hodam, až da siahońnia, akt 25 sakawika ŭ biełaruskim narodzie macnieŭ i štoraz hłybiej kłaŭsia jon u dušu biełaruskuju. Kali heny 25 sakawik nia zdoleŭ tady achapić šyrejšych mas biełaruskaj hušči tak, kab biełarusy sami abaranili swaju samastojnaść, to fakt faktam astaŭsia, što 25 sakawik zapaliŭšysia nia zhas i pataptany—žyćcia swajho nie adroksia. Praz 18 hadoŭ my dawiedalisia, što siła 25 sakawika robicca matornaj siłaj usiaho biełaruskaha žyćcia i što raz wyraźniej jana apanowywaje ŭwieś biełaruski narod. Heny 25 sakawik,—najnawiejšy twor biełaruskaha ducha, usiaho biełaruskaha narodu. Za 18 hadoŭ my ŭžo daśpieli akuratna zrazumieć jaho, usiebakowa razhledzić i acanić mahutnaść biełaruskaha narodu, što tak zaŭsiody rwiecca da samastojnaha žyćcia. My nie pakiniem nikoli henaha 25 sakawika. Jon budzie našaj zorkaj jak na ciomnym, tak i na świetłym horyzoncie našaha žyćcia. Chto sa starych, abo i maładych biełarusaŭ nia wiedaje siahońnia mahutnaj siły 25 sakawika?—Niachaj ab hetym skaža nam hety 1936 hod. U hetym dni, 25 sakawika, inačaj bje kožnaje biełaruskaje serca. Prysłuchajciesia da jaho tolki wy ludzi! Ci-ž u nas niama roźnicy pamiž budnimi dniami i 25 sakawikom? Budnija dni nam ciažkija, bo biełaruskaja daroha ścielicca dla ŭsich nas asotam i cierniem. Ale hetaje naša narodnaje świata: 25 sakawik, jak balsam na rany, tak jano asałodžwaje nam žyćcio. Siahońnia kožnaje biełaruskaje serca nadta lubić 25 sakawik. Takija ci hetkija biełarus spaŭniaje abawiazki, na tym ci na inšym stanowišču jon pracuje, ci astajecca jon na chudym swaim rodnym zahonie, ci, jak heny listok, adarwany daloka, błudzie jon na čužynie, jak pryjdzie 25 sakawik, to serca kožnaha biełarusa tady rasčulajecca, jak wosk, miakčeje, niejkaha nowaha žyćcia nabirajecca. Praz serca swajo ŭ hety dzień biełarus zanurajecca ŭ niejki sałodki mistycyzm. Hłuchim jon robicca na ŭsie swaje biedy, źniačulajecca na ździeki swaich worahaŭ, zataplajecca ŭ ekstazie niečaha dobraha, ščaśliwaha, jak dla siabie asabista, tak i dla swajej šyrokaj staronki i dla swajho narodu.

U hety dzień biełaruski rozum jaśnieje świathom swaich ułasnych siłaŭ. Biełarus kruhom siabie šyrej pa świecie razhladajecca. Jahony rozum bača, što biełaruskija syny na swajej baćkaŭščynie z čužych ruk hladziać tolki i žywiacca jany nia chlebam, ale kroškami, što spadajuć sa stała mahutnych hetaha świetu. Na 25 sakawika biełarus lepš razumieje histaryčnaje i hieohrafičnaje pałažeńnie swajho narodu ŭ Eŭropie. U hety dzień swajho nacyjanalnaha świata biełarus chapaje lohka tuju praŭdu, što biełarus sam sabie jość kawalom swajho ščaścia. Usie mury, jakija biełarusu stajać na darozie da lepšaha žyćcia, u hety dzień jon swaim rozumam prabiwaje, i ŭznosicca niekudy wysoka ŭharu, kab adtul swabodna aceńwać usio biełaruskaje dobraje i błahoje.

I čym bolš prajaśnicca biełaruski rozum na 25 sakawik, tym skarejšaje dla biełaruskaha narodu wyzwaleńnie. U hety ščaśliwy dzień 25 sakawika nabirajecca biełarus pierakanańnia, što niezaležnaść jahonaha narodu nastupie tady, kali biełaruskaja dumka achopie jasna ŭwieś biełaruski narod i ŭskałychnie im tak, što narod hety sam pojdzie napierad, šukajučy sabie ščaśliwiejšaha wychadu da lepšaj biełaruskaj doli.

I wola biełaruskaja na 25 sakawik ažyŭlajecca. Usie biełarusy ciapier napaŭniajucca dobrymi imknieńniami, dobrymi chacieńniami, dobrymi nachiłami. Ale i heta treba skazać, što jak ptuška ŭ kletcy, tak biełaruskaja wola na 25 sakawik u 1936 hodzie. Prachodziać hady, a biełarus biaz niezaležnaści astajecca. Praz hety čas biełaruski duch razrośsia nadta, ale nia maje jon tej swabody ruchaŭ, jakaja jamu naležycca.

Dyk što ž nam rabić u hety 25 biełaruski sakawik?—Naležna jaho nam adświatkawać treba. Kožny biełarus, chto hdzie jość, u hety dzień chaj padumaje pra niezaležnaść Biełarusi, choć uzdychnie za tej dolaj, jakaja ŭ hety dzień uśmichajecca da biełaruskaha narodu. Naš 25 sakawik u 1936 hodzie, chaj budzie dla nas tym asiarodkam, abo lepš tym silnym mahnesam, jaki da siabie pryciahnie kožnaha biełarusa i daść jamu tuju biełaruskuju siłu, jakaja ŭ našych dušach razrosšysia, stwora biełaruskuju niezaležnaść!

W. D—a.

Z dziejnaści Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury

Centralny Urad Bieł. Instytutu Hasp. i Kultury prypaminaje tym hurtkom (Biełaja, Arlaniaty, Dziemiašy, Miedniki, Jeśkawičy, Daniušawa i inšyja), jakija dahetul nie parupilisia prysłać sprawazdačy z swajej dziejnaści za 1935 h., ab abawiazku prysyłki henaj sprawazdačy ŭ jak najchutčejšym časie.

Centralny Urad BIHiK.

Žodziški, Wialejskaha paw. Dnia 26.I. h. h. adbyłosia ahulnaje sabrańnie siabroŭ Žodzišnaha Hurtka Bieł. Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ pamieškańni P. Maroza ŭ m-ku Žodziškach. Prysutnych siabroŭ na sabrańni 20 asob.

Paradak dnia: 1) Wybary prezydyjumu. 2) Sprawazdača z dziejnaści hurtka za 1935 h. 3) Wybary nowaha ŭradu. 4) Plan pracy ŭ budučynie. 5) Damahańnie rodnaje škoły. 6) Sprawa samaadukacyi. 7) Kursy dla siabroŭ. 8) Supolnaje čytańnie knižak. 9) Biahučyja sprawy.

1) U prezydyjum ahulnaha hadawoha sabrańnia byli wybrany siabry: na staršyniu—Kazimier Čartowič, na sakratara—Franuk Hryb, zasiadacieli: Anton Hryškiewič i Witalis Cikota.

2) Sprawazdaču z dziejnaści hurtka za minuły hod zdaŭ staršynia hurtka Andrej Cikota. Z sprawazdačy sabrańnie dawiedałasia, što ŭrad zładziŭ dwa pradstaŭleńni ŭ wioscy Syčaniatach, adno było zładžana 20.I.35 h., druhoje 14.VII.35 hodu i adbylisia try pasiedžańni ŭradu hurtka. Bibliateka raźwiwajecca dobra, za 1936 h. pračytana 220 knižak ŭsialakaha wydańnia i źmiestu. U kasie hurtka znachodziłasia 68 zł. 15 hr., raschodu za 1935 h.—29 zł. i 10 hr. Ciapier jość u kasie hurtka 39 zł. i 5 hr.

3) Urad hurtka na 1936 h. wybrany toj samy, h. zn. na staršyniu, Andrej Cikota, na skarbnika—Anton Babok, na sakratara—Michał Rydziel; u zastupniki: Michał Maroz i Franuk Hryb.

4) Pastanoŭlena da zapust zładzić adno pradstaŭleńnie i wiečarynu, a zaraz paśla Wialikadnia zładzić druhoje pradstaŭleńnie. Daručana siabru Kaziuku Čartowiču da Wialikadnia pračytać dźwie lekcyi.

5) Pastanoŭlena damahacca adkryćcia biełaruskaj škoły i dziela hetaha prawieści akcyju składańnia školnych deklaracyjaŭ.

6) Pastanoŭlena, kab siabry wučyli swaich dzietak pabiełarusku, a tak ža pamahali inšym baćkom nawučać dziaciej čytać i pisać pabiełarusku.

7) Pastanoŭlena, što abawiazkam kožnaha siabry jość ładžańnie supolnaha čytańnia knižak i hazet dziela samaadukacyi.

8) Daručana ŭradu hurtka zładzić jubilej 10-hadowaha isnawańnia Hurtka Bieł. Inst. Haspadarki i Kultury ŭ Žodziškach u hetym 1936 h.

9) Pastanoŭlena wiasnoj zładzić majoŭku i naahuł ładzić tawaryskija wiečaryny. Wyražana padziaka haspadyni Paŭlinie Maroz za pamieškańnie, u jakim užo 10 hadoŭ biaspłatna mieścicca Žodzišny hurtok BIHiK. U kancy prypomniena, što siabry pawinny jadnać nowych siabroŭ ŭ hurtok.

Pastanoŭlena, kab siabry ŭrehulawali swaje składki da 1-ha krasawika h. h. Na hetym sabrańnie zakončana.

* * *

Dadatkowa pawiedamlajem, što punktu 4 ha ab lekcyjach nia wykanali, bo na złađžańnie ŭ pačatku lutaha h. h. lekcyi na temu: „Praca ŭ kulturna-aświetnych hurtkoch“ nie dastali ad administracyjnaj ułady dazwołu. Lekcyju mieŭsia čytać K. Čartowič. Ciapier hatujem spektakl-wiečarynu, jakaja maje adbycca paśla Wialikadnia. Budziem stawić „Pana Ministra“.

Hatujemsia da pawažnaha adświatkawańnia 10-tych uhodkaŭ isnawańnia Žodzišnaha hurtka BIHiK. Naš hurtok zasnawaŭsia ŭ 1926 hodzie, zaraz paśla zalehalizawańnia Ministerstwam Unutr. Spraŭ Statutu BIHiK.

* * *

AD CENTRALNAHA URADU BIHiK. Światkawańnie 10 tych uhodkaŭ isnawańnia wiaskowaha kulturna-aświetnaha hurtka — heta ŭ našych biełaruskich warunkach wialikaje świata. Centralny Urad zaklikaje ŭsich siabroŭ, jakija naležali i naležać da Zodzišnaha hurtka, adświatkawać hetu ważnuju čosinu z usiej pawahaj i świedamaściaj u tym prakanańni, što jany, praz 10 hadoŭ pracujučy niaŭtomna na niwie biełaruskaj kultury, zrabili wialikaje dzieła. Centralny Urad BIHiK žadaje, kab ab terminie światkawańnia Žodzišny hurtok daŭ znać praz biełaruskuju presu inšym hurtkom Instytutu, kab jany razam z Centralaj mahli prywitać hurtok i hetym pryniać udzieł u jaho radaści. Pažadana było-b pawiedamić i inšyja biełaruskija arhanizacyi.

Centralny Urad BIHiK.

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы!— Пашырайце беларускае друкаванае слова. — Навучайце дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску!

Instrukcyja — parada,

jak twaryć arhanizacyi Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia (BNA) na miascoch u Zachodniaj Biełarusi (pad Polščaj).

I. Praŭnaja padstawa.

Polskaja Konstytucyja hwarantuje hramadzianam Polskaj respubliki swabodu słowa i arhanizacyi, a tak-ža pryznaje wolu raźwićcia ichniaj nacyjanalnaj asabliwaści.

Palityčnyja arhanizacyi ŭ Polskaj respublicy majuć poŭnaje prawa isnawańnia i dziejańnia, a tak-ža swabodu arhanizawańnia swaich siabroŭ u hurtki i nie abawiazany rehistrawać swaich prahramaŭ i statutaŭ, nie abawiazany pawiedamlać ułady ab utwareńni arhanizacyi abo prasić dazwołu na zakładziny arhanizacyjnaha hurtka.

Ab hetym wyrazna kaža abawiazwajučaje nastupnaje ministerskaje rasparadžeńnie:

Rasparadžeńnie Nr. 51 Ministra Unutranych Spraŭ da ŭsich Šefaŭ Sekcyi, Načalnikaŭ Addziełaŭ, Hałoŭnaj Kamandy palicyi i Wajawodaŭ u sprawie lehalizacyi palityčnych partyjaŭ.

Časam bywali wypadki, što padlehłyja mnie ułady wymahali ad palityčnych partyjaŭ, abo ad ich Kamitetaŭ, prymusowaj lehalizacyi na padstawie tymčasowaha dekretu ab arhanizacyjach z dnia 3-ha studzienia 1919 hodu (Dz. Praŭ Nr. 3, pozyc. 88); wyjaśniaju, što partyi palityčnyja, jak arhanizmy z metaj i strukturaj specyfičnaj,. nie padpadajuć pad paniaćcie tawarystwaŭ, abo sajuzaŭ, dziela čaho — zhodna z praktykaj demakratyčnych dziaržaŭ Zachodniaj Eŭropy — prymusowaj lehalizacyi nie padlahajuć.

A kali paŭstajeć sumlewańnie — ci hetaja arhanizacyja źjaŭlajecca palityčnaj partyjaj, tady adpawiednym uładam treba źwiarnucca ŭ Ministerstwa Unutranych Spraŭ.

Waršawa, dnia 17 lutaha 1920 hodu.

Ministar Unutranych Spraŭ.
(—) S. Wojciechowski.

Rasparadžeńnie hetaje abwieščana ŭ Uradawym Dzieńniku Ministerstwa Unutranych Spraŭ Nr. 7, z dnia 25 krasawika 1920 hodu, pazycyja 9 (Dz. Urz. Minist. Spr. Wewn. Nr. 7, z dnia 25.IV.1920 r. poz. 9).

II. Jak pačynać arhanizacyjnuju pracu.

Usiaki čaławiek znaje, što *arhanizacyja — heta wialikaja reč.* Ale nia kožny wiedaje, jak da jaje ŭziacca. Woś zatym i wydajom hetu instrukcyju, jakaja maje pakazać usim wiaskowym i miestačkowym dziejačam, jak jany pawinny bracca za rabotu i jak arhanizawać narod.

Instrukcyja padaje ŭsie arhanizacyjnyja prawiły i zakony, pawodle katorych treba pastupać, pačynajučy i wiadučy arhanizacyju. Zatym instrukcyju treba čytać uważna, knižku bierahčy, bo jana zaŭsiody prydasca, asabliwa pry znosinach z uładami. A znajučy zakony i prawiły, možna śmieła wiaści rabotu, nie ŭhladajučysia na roznyja strachi i pieraškody, bo ŭ *našym Kraju kožnaja palityčnaja arhanizacyja, jakaja maje lehalnuju prahramu i statut, moža* śmieła arhanizawacca biaz nijakich pieraškodaŭ sa starany ułady.

Jakaja-ž prahrama budzie lehalnaj? Lehalnaj budzie taja prahrama, jakaja wyjšła z druku i nie skanfiskawanaja polskimi ŭładami. Značyć i palityčnaja arhanizacyja budzie zalehalizawanaj, kali nadrukawała swaju prahramu i kali taja prahrama ŭładami nie skanfiskawanaja. A Biełaruskaje Narodnaje Abjednańnie (karaciej: BNA) swaju prahramu abwieściła drukam — značyć jana jość arhanizacyjaj *lehalnaj* — i zatym moža ŭsiudy adkrywać swaje arhanizacyjnyja hurtki.

Jak arhanizawacca? Pieradusim treba dastać i dobra *pračytać prahramu i statut* Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia, a potym pašukać ludziej. Šmat chto narakaje, što niama świedamych ludziej, z katorymi možna budzie pačynać rabotu — adnak pašukaŭšy ludzi zaŭsiody znajducca. I, praŭdu kažučy, niama takich trudnych warunkaŭ, u jakich nia možna było-b stwaryć arhanizacyju Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia. Nawat kali jość adzin świedamy i achwočy da pracy i zmahańnia čaławiek, i kali ŭsie susiedzi niaświedamyja i nawat nie spačuwajučyja, dyk i tady treba bracca da pracy, bo i pry hetkich warunkach možna mnoha zrabić.

Pačynać treba cicha. Nia možna marnawać sił na zmahańnie suproć usich. Treba pašukać adnadumcaŭ. Znajšoŭšy, pawučyć ich pierakanać, padkrapić ich hazetaj, prahramaju i inšymi drukami. Kali pierakanajucca, zaachwocić da pracy supolnaj, i tady praca pojdzie chutčej.

Kali budzie ŭžo troch ci bolej siabroŭ z adnaje wioski, abo z najbližejšaj wakolicy, wybirajcie tady kiraŭnika. Dajcie jamu prawa źbirać Was na narady. Kožny pawinien wiedać, što *kali kličuć, dyk treba jści.* Kali nia budzie prychodzić, dyk nie karyść z takoha siabry, a strata, bo jon i ŭ druhich budzie adbiwać achwotu. *A kab Wy mahli źbiracca biaz pieraškod, jak lehalnaja arhanizacyja*

З эканамічна-гаспадарчага жыцьця

Цяжка жывецца ў вёсцы, з кожным днём гэнае жыцьцё яшчэ ўсё пагаршаецца і нічога ня робіцца, каб палепшыць палажэньне вёскі У гэтым і трагэдыя нашага народу; народ скаціўся на дно абяднеьня і поўнай бязнадзейнасьці.

Перадусім беззямельле, якое штогод павялічваецца з прычыны прыросту насельніцтва, зямельная рэформа не праведзена, аб эміграцыі і гутаркі няма.

У буджэтнай камісіі польскага сойму пасол Томашкевіч у студзені г. г. падаў лічбу 1.400 000 асоб беспрацоўных, якія сядзяць галоднымі, страціўшы надзею, што яны знайдуць працу.

Гэтая лічба датычаць толькі тых, каго запісалі і хто „лезе ў вочы." Калі-ж узяць пад увагу, што пераважная большасьць галодных людзей сядзіць ціха, бо добра ведае бескарыснасьць шуканьня заработкаў — то колькасьць беспрацоўных і галодных будзе значна большая.

Польскі эканаміст Язэп Понятоўскі аблічыў, што ўсяго ў Польшчы налічваецца людзей, патрабуючых працы—8 мільёнаў асоб, што становіць больш як палавіну ўсяго дарослага насельніцтва.

Пераважная большасьць з гэтых 8 мільёнаў прыпадае на вёску.

Гэтакая жудасная статыстыка была пададзеная Я. Панятоўскім у сьнежні прошлага году ў ягоным рэфэраце, прачытаным у Таварыстве Эканамістаў у Варшаве.

У Соймавай буджэтнай камісіі выявілася наступнае:

З прычыны недаяданьня і хваробаў маладое пакаленьне зрабілася слабасільным. Пасол д-р Краўчынскі казаў—у апошнія часы камісіі навабранцаў змушаны ня прымаць ужо амаль палову пакліканых у войска... Ёсьць гэта вынікі бяды і дрэннага аджыўляньня.

Сьмяротнасьць сярод дзяцей дайшла да 14,3 проц.; злачынцамі напоўненыя астрогі.

Пададзеныя вышэй лічбы датычаць усей Польшчы.

Калі-ж пяройдзем цяпер на нашыя землі, то пабачым тут яшчэ больш гора і бяды.

Усе балячкі, якія наглядаюцца ў жыцьці Польшчы, у нас маюць яшчэ паважнейшы характар.

На гэта зьвярнула ўвагу ня толькі беларуская, украінская і літоўская прэса, але й тыя польскія эканамісты, каторыя ня страцілі яшчэ здольнасьці разглядаць справы такімі, якімі яны ёсьць у запраўднасьці. Гэтак, напрыклад пасол польскага сойму д-р Улад. Вэльгорскі, каторы з даручэньня Рады Міністраў робіць досьледы гаспадарчага і палітычнага жыцьця на „Усходніх Землях," (беларуска-літоўска-украінскія землі), сьцьвердзіўшы вялікую розьніцу паміж гаспадарчым палажэньнем нашых земляў і рэшты дзяржаўных абшараў, прышоў, між іншым, да наступных вывадаў:

1. „Фактам ёсьць, кажа ён: „што амаль усе вялікія скартэлізаваныя прадпрыемствы працуюць па-за абшарамі „Усх. Земляў" і таму вялікі гарач, плачаны надмернымі цэнамі не знаходзіць ніякай рэкампэнсасты, бо нават і частка грошаў, высмактаных з „крэсавага" насельніцтва не вяртаецца ў кішэні гэтага апошняга, дзеля таго, што яно пазбаўлена ўсякіх магчымасьцяў да заработку.

2 Крэдытовыя установы „Усх. Земляў" перадаюць запасы сваіх укладаў у распараджэньне дзяржаўнага скарбу. У замен за гэта дзяржава не зьвяртае пабраных укладаў у постаці адпаведных крэдытаў, патрэбных на гаспадарчыя мэты „Усх. Земляў."

Найбольш яркім прыкладам у гэтых адносінах — кажа Вальгорскі — быў падзел інвэстыцыйнага фундушу. Вялікі абшар краю „Усх. Зямель" атрымаў менш гэнага фундушу ад прамысловага павету ў ваяводствах цэнтральных ці заходніх. У часы добрай коньюнктуры на „Усх. Землях" выэксплёатаваныя іхнія лясныя багацьці і фактычны даход вывезены ў ваяводзтвы цэнтральныя або заходнія.

Гэтак кажа польскі афіцыяльны дасьледчык.

А беларусы, украінцы і літоўцы ня толькі гэта ўсё бачаць, але і цяжка адчуваюць.

А. Пінчук.

Krywawy strajk ŭ Krakawie

Na dzień 23 sakawika siol. byŭ abwieščany Sajuzam Prafesyjanalnych Sajuzaŭ ahulny strajk u Krakawie, jak pratest suproć žorstkaj likwidacyi strajku ŭ fabrycy „Semperit".

Strajk achapiŭ rabotnickija masy. Adbyŭsia mitynh u pamieščańni Prafesyjanalnych Sajuzaŭ. Kali paśla mitynhu ludzi razychodzilisia z natoŭpu pasypalisia kamieńni i rewalwerowyja strełу ŭ addzieł palicyi. Palicyja wystupiła z aružžam. Pačalisia sutyčki demanstrantaŭ z palicyjaj pa całym horadzie. U wyniku hetaha 30 asob ranienych i 6 zabitych.

Z Litwy

Prystań Kłajpeda ŭ minułym hodzie. Z paŭstańniem na świecie kryzysu, mnohich krajoŭ słaŭnyja i wialikija prystani značna padupali. Tolki niekalki prystaniaŭ patrapili swaju dziejnaść utrymać niaźmienšanaj. Pamiž hetymi jość i Kłajpedzkaja prystań. Heta prystań siańnia prytarnawanaja da ŭsich sučasnych wymohaŭ. Daŭniej, kali jana naležyła da Niamieččyny, mahli ŭ jaje ŭpływać tolki małyja wadapławy. Ciapier, budučy prystaniaj litoŭskaj, wyrasła jana na wialikuju i wyhodnuju, u jakuju prypływajuć najwialikšyja marapławy z usiaho świetu. Za ŭwieś 1935 hod u Kłajpedzkuju prystań było prypłyŭšy 1225 marapławaŭ. U paraŭnańni z 1934 h. ruch u prystani pawialičyŭsia na 20 prac. Letaś praz hetu prystań było wywieziena 441.107 ton tawaraŭ na 116,9 milijonaŭ litaŭ, a ŭwieziena 666,000 ton na 91 8 milijonaŭ litaŭ.

Padmoha na palepšańnie łuhoŭ. Z raźwićciom małočnaj haspadarki, litoŭskija sialanie i ich arhanizacyi, a tak-ža ŭrad, pačali rupicca palepšyć łuhi i paśbiščy, kab takim sposabam patanieŭ i jašče bolš raźwiŭsia wyrab masła. Prastor usich łuhoŭ i paśbiščaŭ u Litwie zajmaje da 1.300 000 ha. Dziela taho, što ŭradžejnaść hetaha prastoru dawoli drennaja i patrabuje palepšańnia, — litoŭski ŭrad i Ziamielnaja Haspadarskaja Pałata ŭžo ad 1928 h. pačali dawać naharody i padmohi na henych prastoraŭ palepšańnie. Hetaja padmoha haspadarom duža ważnaja i patrebnaja, bo daje im wialikuju karyść.

Kožny hod pad kulturnyja paśbiščy i łuhi pryhataŭlajucca wialikija prastory. Letaś u-wa ŭsiej Litwie było pryhatawana 584 ha kulturnych paśbiščaŭ, na što było wydana sialanam 21 745 litaŭ padmohi, z jakich skarystała 619 sialan. Ciapier u-wa ŭsiej Litwie kulturnych paśbiščaŭ — 3 745 ha.

Na asušanych prastorach letaś pryhatawana prykładnych łuhoŭ 1900 ha, na što wydana 79.872 lity padmohi, z jakich skarystała 1 069 sialan.

Aprača hetaha, letaś było naładžana 355 pakaznych daśledčych punktaŭ (pa 1/8 ha na kožny punkt) i na heta wydana 6 769 litaŭ. Tak-ža letaś było arhanizawana 10 punktaŭ z pryładami palapšać łuhi.

Usiaho na palepšańnie łuhoŭ i paśbiščaŭ tolki za 1935 h. litoŭski ŭrad wydaŭ zapamohi 108 375 litaŭ.

Wyrab i wywaz masła ŭ 1936 h. Za studzień miesiac sioleta Litwa wywiezła zahranicu 448.428 klg. masła. Letaś za hety samy miesiac było wywieziena 288.505 klg Sioleta takim čynam wywaz masła za studzień miesiac pawialičyŭsia na 55 prac. I ahułam sioleta jość nadzieja wywazu masła značna pawialičyć. Dumajuć sioleta wywieści 15 miljonaŭ klg. (Polšča wywozić tolki 5 miljonaŭ klg). Litoŭskaje masła zahranicaj cenicca wysoka i maje dobruju sławu.

Z „Musu Artojas" Nr. 5, 1936 h.
P. Ł.

З Украінскага жыцьця

75-ыя ўгодкі Т. Шэвчэнкі. Сёлета 15 сакавіка мінула 75 гадоў пасьля сьмерці Тараса Шэвчэнкі — паэта і прарока Украіны. Украінцы, бяз рожніцы палітычных пракананьняў, арганізавана ва ўсіх сваіх арганізацыях аддалі чэсьць Вялікаму Украінцу ў 75-ыя ўгодкі ягонай сьмерці, ладзячы адпаведныя акадэміі.

Украінцы абходзілі сьвята Шэвчэнкі ва ўсім сваім краю — у Савецкай Украіне пад уладай бальшавіцкай, і на Валыні, і ў Галіччыне пад Польшчай, а так-жа ў Варшаве, і на эміграцыі.

Арышт сьвяшчэньніка на Шэвчэнаўскім сьвяце. У Галіччыне, у Рогатынскім павеце падчас акадэміі ў чэсьць Т. Шэвчэнкі украінскі сьвяшчэньнік а.С. Баслядынскі сказаў прамову, за якую паліцыя загадала спыніць акадэмію, а прамоўцу а. Баслядынскага, па загаду пракурора, арыштавала. Прамоўца, як падае афіцыяльная прэса, гаварыў быццам „нецэнзуральна."

З украінскага жыцьця на Валыні. Украінскае сялянства на Валыні жыве сваім асобным жыцьцём, не зважаючы на натугі казённай партыі ВУО (Валынскае Украінскае Аб'еднаньне), якое стараецца Валынскае украінскае русло скіраваць у бок Варшавы.

Жыцьцё украінскага сялянства на Валыні мае свае болі і радасьці. У самым нізе пашыраецца камунізм, знаходзячы там сабе адпаведны грунт, які прыгатовіла ў сялянстве бяда і гора. З камунізмам змагаецца Царква і казённае ВУО. Сялянства ня мае сутычнасьці з сваёй, украінскай інтэлігенцыяй, ня мае нацыянальна-ўсьведамляючай украінскай кніжкі, ня мае так-жа і рэлігійнай літаратуры ў роднай мове. Казённых павадыроў сяляне не прызнаюць, і жывуць сваім жыцьцём. У гэтым „сваім" жыцьці украінскіх сялян прабуджаецца нацыянальная сьведамасьць і праяўляецца украінскі патрыятызм.

Словам, нацыянальнае адраджэньне украінскага сялянства на Валыні, хоць і ў цяжкіх абставінах, але паступае ўперад.

Грынь.

Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia, patrabujcie z Centrali BNA deklaracyjaŭ i siabroŭskich biletaŭ.

Kali budzie patreba i budzie achwočych u wakolicy siabroŭ pracawać u miascowaj arhanizacyi, zwaročwajciesia ŭ Centralu BNA, kab dała zhodu na adkryćcio hurtka.

Twarecie swaje Hurtki!

Starajciesia pawialičyć swoj Hurtok i adnačasna raspaŭsiudžywańniem hazety ŭświedamlajcie palityčna biełaruskija masy ŭ Wašaj wakolicy. Na sabrańniach swaich pawinny razam pahawaryć, što kožny z Was pawinien rabić i jak pawinny adzin druhomu pamahać.

Kali Was budzie bolej świadomych, tady ŭžo *Wy źjaŭlajeciesia peŭnaj značnaj siłaj* i možacie tak sarhanizawacca, jak pakazwaje naš Arhanizacyjny Statut. Wybirajcie tady spasiarod siabie staršyniu, sakratara i skarbnika.

Henyja ŭtroch razam składajuć Kamitet Wašaha Hurtka.

III. Praca Hurtka.

Kali ŭ Was užo jość arhanizacyja i kali Wy daručyli swajmu Kamitetu adpawiednuju pracu, niachaj kožny z Was padumaje, *što pawinien rabić zaraz ža, siańnia?* Kamitet nia wybrany dziela taho, kab tolki zwacca kamitetam i ničoha nie rabić. Jon wybrany na toje, kab sačyć za pracaj i nadawać kirunak, *ale samuju pracu pawinny rabić usie: wybranyja ŭ Kamitet i niawybranyja.*

Pracy dla Hurtka i kožnaha z jaho siabraŭ jość šmat. Razhledzim paparadku ŭsie mahčymaści pracy:

a) uświedamlańnie biełaruskich masaŭ,
b) pašyrańnie hazet i litaratury,
c) adkrywańnie biełaruskich škołaŭ i h. d.

Najlahčej i najlepš *wučyć pracoŭnyja masy wioski i miesta i budzić u ich duch raspaŭsiudžywańniem hazety: „Biełaruskaja Krynica".*

Kali Wy ŭžo świedamyja i biareciesia za arhanizawanuju rabotu, zaraz-ža staŭcie pytańnie: *jak razychodzicca i pašyrajecca hazeta ŭ Wašych wakolicach?*

Niachaj kožny zapiša pačarzie ŭsie akaličnyja wioski, pačaŭšy ad najbližejšych, kudy jšče ni adna hazeta nie papała Niachaj zaraz ža znajdziecca achwotnik spasiarod Was, jaki woźmiecca aznajomić wiosku z hazetaj, rastałkuje ŭ čym sprawa, i zaachwocić sialan wypisać swaju hazetu. Dzie adzin uhawaryć nia zdoleje, niachaj druhija jamu pamohuć.

Kali chočaš kaho da hazety zaachwocić, dyk treba ŭpierad hetuju hazetu pakazać i pračytać, abo jaho samoha namowić pračytać. Dziela hetaha kožny siabra pawinien wypisać sabie hazetu i zaachwocić da wypiski druhich.

Nie škadujcie hrošaj na hazetu, bo hazeta heta najpieršaje aružža i najkaryśniejšaja za ŭsio ŭ našaj pracy. Kali nie chapaje hrošaj i adnamu ciažka wypisać hazetu, tady ŭdwoch, abo ŭtroch złažeciesia, wypiščie i čytajcie jaje razam.

Kali zaachwociŭ kaho da swajej hazety, zaraz-ža wyšli ŭ redakcyju jaho adras i prasi wysłać jamu hazetu. Nazawi ŭ piśmie wyrazna jaho imia i proźwišča, wiosku, pawiet i *abawiazkawa poštu*, bo jak nia budzie wyznačana pošta, dyk niawiedame, jak wysyłać hazetu. Nowuju padpisku i adrasy dla wysyłki probnych numaroŭ hazety treba prysyłać nie paźniej 20 čysła kožnaha miesiaca.

Adnačasna treba rastłumačyć padpiščyku, kab jon prysyłaŭ hrošy na hazetu, bo inačaj hazeta moža być raptam jamu spyniena i nia wysyłacca.

Pilnujcie, kab hazeta prychodziła da Was biez pieraškod. Kali hazeta prapała, spraŭciesia, chto ŭ tym winien. Kali hazeta prapała na pošcie, zaraz-ža pišecie ŭ redakcyju. List pisać i pasyłać u redakcyju ŭ hetaj sprawie možna biez kanwertu i biaz marki; na kawałačku čystaj papiery treba pisać tak:

R e k l a m a c y j a   g a z e t o w a

Pawiedamlaju, što nie atrymaŭ hazety „Biełaruskaja Krynica" Nr. . . . . a dalej — napisać tolki swajo imia, proźwišča, wiosku i swaju poštu, adkul hazetu atrymliwajecie.—Bolš ničoha nia možna pisać u reklamacyi, bo kali napisać jašče što, dyk tady ŭžo patrebny marki, jak da zwyčajnaha piśma.

Na adwarotnaj bačynie kartki treba napisać adras redakcyi hazety: *Redakcyja hazety „Bieł. Krynica", Wilno—Wilnia, Zawalnaja 1—1.*

Mahčyma, što časam i henaja reklamacyja moža prapaści. Dziela hetaha radzim adnačasna prysyłać adrazu ŭ redakcyju i list, u jakim treba napisać ab usim, tolki abawiazkawa adznačyć — jaki numar hazety zahinuŭ. List abawiazkawa treba apłačwać markami, kab nie naražać redakcyju na dubaltowy raschod.

Kali ž Waša hazeta prapała nie na pošcie, a ŭ inšym miescy, tady dachadzicie sami, dawiedajciesia, chto ŭziaŭ Wašu hazetu, padajcie świedkaŭ i pišecie ŭ redakcyju. Redakcyja budzie sama wystupać pierad centralnymi ŭładami ŭ abaronie swajej hazety. Pomnicie toje, što zabaraniać čytać hazety nichto nia maje prawa.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Лекцыя кс. В. Гадлеўскага. У мінулую нядзелю г. м. у залі Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры ў Вільні старшыня Інстытуту кс. В. Гадлеўскі прачытаў чарговую, з цыклю беларускае гісторыі, публічную лекцыю на тэму: „Берасьцейская рэлігійная унія 1596 г." Зацікаўленьне лекцыяй было вялікае.

Новы беларускі сцэнічны твор. Нядаўна выйшаў з друку новы беларускі сцэнічны твор Міхася Машэры п. н. „Чорт з падпечча"— ёсьць гэта абразок з сялянскага жыцьця. Кніжыца гэта мае 24 бач. Цана яе 40 гр.

(Б. В.) Беларуская справа і часапіс „Папросту." Ад восені мінулага году выходзіць у Вільні польскі часапіс „Папросту," які выклікаў сярод беларусаў пэўны водгалас дзеля таго, што пачаў пасьвячаць беларускай справе адносна больш месца і ўвагі, чымся дагэтуль рабіла польская прэса наагул. Больш таго, прадстаўнікі гэтага часапісу публічна выказваюцца аб радыкальнай патрэбе разьвязкі беларускай справы, адкрыта прызнаючы землі заселяныя беларусамі—беларускімі. Такое становішча рэдакцыйнай калегіі час. „Папросту" адносна беларускай справы здабыло сабе прызнаньне нават з боку некаторых перадавых павадыроў беларускага руху. Беларуская студэнцкая моладзь выказала свае пагляды на гэтую справу на дыскусыйным рэфэраце на вышэй ўспомненую тэму: „Беларуская справа і часапіс „Папросту." Рэфэрат гэты, чытаў грам. Барановіч дня 18 сакавіка сёл. у Беларускім Студэнцкім Саюзе. Пасьля рэфэрату ў ажыўленай дыскусіі бралі ўдзел: сябры Саюзу, многія госьці, а такжа прысутны на рэфэраце выдавец час. „Папросту" гр. др. Г. Дэмбінскі. Агульны высновак з дыскусіі: часапіс „Папросту" настолькі заслугоўвае на пазытыўныя адносіны да яго беларускай апініі, наскольки адносіны самога часапісу да беларускай справы будуць і далей пазытыўныя.

Падзяка. Беларускі Інстытут Г. і К. дзякуе гр. К. Юхневічу за прысланыя ў музэй Інстытуту 2 манэты; гр. Я. Вышамірскаму за 2 манэты, а так-жа за 4 кніжкі, каторыя будуць перасланы ў Расьлянскі гуртох.

З САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

(Б. В) Савецкая Беларусь скалектывізавана на 86%. Паводле савецкай прэсы, за мінулы год у БССР. было скалектывізавана далейшых 106.405 земляробскіх гаспадаркаў, так што цяпер у БССР. ёсьць 10.500 калгасаў. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў апошнім квартале мін. г. у параўнаньні з трэцім кварталам згўважыўся комасацыйны працэс колектывізацыі г. зн. паасобныя меншыя калгасы лучыліся ў большыя адзінкі, праз што агульная лічба калгасаў, паміма далейшага калектывізацыйнага працэсу, у апошнім квартале зьменшылася на 378. Агульная лічба скалектывізаваных гаспадарак ў БССР пад канец 1935 г. раўнялася 671,919, што становіць 85,6 проц. У параўнаньні з 1934 г. працэнтныя адносіны скалектывізаваных гаспадарак з 1935 г. павялічыліся на 13 проц.

ЧЫТАЙЦЕ
адзіны ў Заходняй Беларусі беларускі літаратурна-навуковы квартальны часапіс
„К А Л О С Ь С Е",
у якім зьмяшчаюцца творы перадавых паэтаў і пісьменьнікаў Заходняй і Усходняй Беларусі, а так-жа артыкулы навуковага характару.
Складка на асобную кніжку найменш 1 зл.
Адрас рэдакцыі і адміністрацыі „КАЛОСЬСЯ":
Вільня, Завальная вул. №1—2.

Rada Lihi Narodaŭ Niamieččynu asudziła

Paśla asudžeńnia Niamieččyny za zryŭ Wersalskaha i Lokarnaŭskaha traktataŭ pradstaŭnikami Anhlii, Francyi, Italii i Belhii, na konferencyi dnia 12 h. m. asudziła Niamieččynu za heta tak ža i Rada Lihi Narodaŭ, wydajučy hetkuju pastanowu:

„Rada Lihi Narodaŭ, razhladzieŭšy skarhu Belhii i Francyi, padanuju ŭ Radu Lihi 8 ha sakawika 1936 h., śćwiardžaje, što ŭrad Niamieččyny narušyŭ art. 43 Wersalskaha mirnaha dahaworu, uwodziačy zbrojnyja siły i zajmajučy imi 7 sakawika 1936 h. zdemilitaryzawanuju pałasu, ustanoŭlenuju art. 42 i čarhowymi Wersalskaha dahaworu i Lokarnaŭskaj umowy. Rada Lihi Narodaŭ zaklikaje heneralnaha sakratara, kab u wykanańni 2-oj staćci 4-ha ŭstupu hetaj umowy, pawiedamiŭ śpiešna jaje syhnataryjaŭ ab dakananym śćwierdžańni Radaj Lihi Narodaŭ faktu prastupleńnia Niamieččyny.

Takim čynam śćwierdžana, što niamiecki ŭrad narušyŭ mirnyja dahawory i za heta Niamieččyna asudžana, u pieršuju čarhu Belhija, Francyja, Anhlija i Italija, zhodna z hetymi mirnymi dahaworami pawinny nawat zbrojna stanuć suproć Niamieččyny dziela abarony supakoju. Hetak sprawa i pastaŭlena — Francyja, Anhlija i Belhija, a tak-ža i wialikaja bolšaść eŭrapejskich dziaržaŭ wyrazna zaniali stanowišča praciŭ Niamieččyny.

Haazki trybunał i zdemilitaryzawanaja pałasa

Pastanowa Rady Lihi Narodaŭ u sprawie narušeńnia Niamieččynaj mižnarodnych mirnych dahaworaŭ dla niamieckaj palityki stałasia zabojčaj. Niamieččyna ŭ mižnarodnaj palitycy ŭ Eŭropie apynułasia adasobnienaj.

Dziela taho, što niamiecki ŭrad damahajecca śćwierdzić, apraŭdywajučy swoj pastupak narušeńnia mirnych dahaworaŭ, što byccam Francyja pieršaja narušyła hetyja dahawory zaklučeńniem dahaworu z S.S.R.R ab uzajemnaj dapamozie na wypadak wajny. — Sprawa francuska-sawieckaha dahaworu pieradana ŭ Haazki Mižnarodny Trybunał dziela ŭstanaŭleńnia, ci hety dahawor maje jakija kolečy supiarečnaści z Wersalskim dahaworam i lokarnaŭskaj umowaj. Heta adnak nie ŭstrymliwaje pastanowy Rady Lihi Narodaŭ, jakaja źjaŭlajecca ŭ mižnarodnaj palitycy abawiazwajučaj.

U źwiazku z hetymi pastanowami Rady Lihi Narodaŭ majuć być zastasawanyja rašučyja pastupańni — maje być nanawa ustanoŭlenaja zdemilitaryzawanaja pałasa nad Rejnam i absadžana mižnarodnym wojskam.

Słowam, Niamieččynie „cywilizawać" tak Eŭropu, jak Italii Afryku, pakulšto nie ŭdajecca.

Padhatoŭka da wajny na Dalokim uschodzie

Japonija, prawodziačy swaju imperjalistyčnuju palityku ŭ Azii, paśpiešna hatowicca da wajny z S.S.R.R. Zbrajeńni Japonii ŭściaž pawialičwajucca. Intensyŭnaje raźwićcio wajennaha promysłu ŭ Japonii daje mahčymaści japonskaj armii azbroicca ŭ chutkim časie da siły wysokaj miery i na doŭhi čas wiadzieńnia wajny. Japonija, jak padaje balšawickaja „Prawda", moža pastawić da boju 2 milijonnuju, dobra azbrojenuju armiju.

Hetak hatowicca Japonija da wajny z S.S.R.R. Hatowiacca baranicca ad wajny z Japonijaj tak-ža i Sawiety.

Hazety padajuć, što Sawiety z Kitajem zaklučyli tajny dahawor praciŭ Japonii. Balšawiki zabawiazalisia spynić kamunistyčnuju prapahandu ŭ Kitaju i pamahčy nankinskamu ŭradu matarjalna. Za heta Kitaj pryabiacaŭ spynić akcyju praciŭ kitajskich kamunistaŭ, uzmocnić swaje pryhraničnyja wajskowyja addziely praciŭ Japonii i supracoŭničać z balšawickaj armijaj i kitajskim kamunistyčnym wojskam. Apračа hetaha, nankinski ŭrad nia budzie pašyrać swajej suwerennaści ŭ Manholii i budzie ŭsio rabić u parazumieńni z uradam S.S.S.R.

Padhatoŭka da nowaha ładu ŭ SSRR

Balšawickaja hazeta „Prawda" drukuje hutarku Stalina z pradstaŭnikom amerykanskaj presy, u jakoj spatykajem słowy Stalina hetkaha źmiestu.

U Sawietach budzie źmienienaja konstytucyja. Nowaja konstytucyja pačnie abawiazywać u kancy hetaha hodu. Wybary ŭ sawiecki parlamant buduć ahulnyja, biespasrednyja i tajnyja. Wybarnyja śpiski buduć wystaŭlać nia tolki kamunistyčnaja partyja, ale tak-ža i hramadzkija biespartyjnyja arhanizacyi. Pawodle słoŭ Stalina, wybarnaja baraćba budzie zaŭziataja i budzie zakranać mnostwa wastrejšych praktyčnych spraŭ, jakija majuć wialikaje značeńnie dla narodu. U kancy swajej hutarki Stalin zajawiŭ— „Ahulnyja, roŭnyja, biespasrednyja i tajnyja wybary buduć puhaj u rukach nasielnictwa praciŭ błaha pracujučych orhanaŭ ułady. Naša nowaja sawieckaja konstytucyja budzie samaj demokratyčnaj konstytucyjaj u świecie".

Paśla hetaj zajawy Stalina hazeta „Prawda" piša hetak: — „Jana (henaja zajawa — red.) abawiazwaje kožnuju partyjnuju i sawieckuju arhanizacyju ŭžo ciapier".

Słowam, kamunisty ŭ S.S.R.R. źbirajucca pasłabić swaju dyktarskuju napružanaść, kab abapiorcisia na narod i razam z narodam pačać budawać dalejšaje žyćcio. Jakoje heta budzie supracoŭnictwa kamunistaŭ z narodam — pakaža budučynia.

Roznyja wiestki

Z POLŠČY

Žydoŭskaja demanstracyja Dnia 17 h. m. Žydy wa ŭsie Polščy ładzili demanstracyi ŭ znak pratestu suproć antysemityzmu.

Zakon ab uboju ŭ bojniach. Zakonadaŭčyja pałaty — Sojm i Senat, pryniali zakon, jakim maje być urehulawana sprawa ŭboju žywioły ŭ bojniach.

Wialiki strajk. U Łodzi dwa tydni trywaŭ strajk tkackich rabotnikaŭ. Strajkawała bolš 120 tysiač rabotnikaŭ. Arhanizacyja kapitalistaŭ strašenna wykarystoŭwała ŭ tkackim promyśle ŭ Łodzi rabotnikaŭ. Dziela hetaha sympatyja hramadzkaj apinii staić za strajkujučych rabotnikaŭ.

Z ZAHRANICY

Zatopa ŭ Amerycy. U Złuč. Št. Ameryki ŭ dalinie raki Ohojo razwodździe zatapiła bolš 50 miestaŭ. U 14 štatach, abniatych razwodździem, utanuła 240 asob, a 300 tysiač ludziej apynułasia biaz strachi nad haławoj.

Rabunki i padpały ŭ Hišpanii. Hazety padajuć, što ŭ Hišpanii pačalisia ŭznoŭ padpaliwańni kaściołaŭ i rabunki.

Pamior Wenizelos. Wiedamy hrecki palityk Wenizelos, jaki jašče niadaŭna byŭ padniaŭšy ŭ Hrecyi paŭstańnie, 18 h. m. pamior u Paryžy, dzie prabywaŭ jak emihrant.

Italijanska-abisynskaja wajna. Italijancy atakujuć abisyncaŭ aeraplanami — kidajuć bomby i niščać abisynskija miesty. Abisyncy baroniacca na ŭsim froncie, ale italijancy ŭsiudy ich pieramahajuć.

Wybary ŭ Niamieččynie. U niadzielu 29 sakawika ŭ Niamieččynie adbuducca wybary ŭ Rajchstach — niamiecki parlamant.

Пісьмы з вёскі

З жыцьця Клецка.

(Нясьвіскі пав.).

Клецк даволі бойкі гандлёвы пункт. Тры вялікія палескія шляхі, якія крыжуюцца ў Клецку, прыносяць яму вялікія гандлёвыя абароты. Гандаль вылучна ў руках жыдоў. Дагэтуль у Клецку няма аніводнае коопэратывы, за тое ёсьць 10 рэстаранаў. Насельніцтва Клецка складаецца з беларусаў, жыдоў, татараў і наплывовых палякоў — дзяржаўнай і самаўрадавай адміністрацыі Беларуская нацыянальная сьведамасьць пашырана тут слабавата. Беларускай прэсы ў Клецк прыходзіць мала. У Клецку няма ніякае культурна-асьветнае або якой іншай беларускай арганізацыі. Клецкая беларуская моладзь замест адкрываць свае арганізацыі запісваецца ў розныя „стшэльцы," „кракусы," гуляе ў карты, п'е гарэлку і часьценька б'ецца між сабой. У той час, калі Клецкае беларускае грамадзянства, як старэйшае, так і маладое вядзе сонлівае жыцьцё, жыдоўскае грамадзянства праяўляе вялікую рухлівасьць у грамадзкім жыцьці. Жыды маюць у Клецку сваю гімназію, дзьве рабінацкія сэмінарыі, дзьве пачатковыя школы, сваю гміну, свой банк, сваю арганізаваную лекарскую помач, свае культурна-асьветныя арганізацыі свой аматарскі тэатр і г.д.

Клецкі магістрат пабудаваў публічныя адходнікі з якіх у цёплыя дні разносіцца страшэнны смурод па ўсьму Клецку, а ў адходніках столькі бруду, што трудна нават перастуціць.

Па рынку свабодна ходзяць сабакі, сьвіньні, каровы, козы і г.д. Тут-жа пры рынку месьціцца пастарунак паліцыі.

Недалёкі.

Miłašowa, Drujskaj woł., Brasłaŭskaha paw. U našaj wioscy jość polskaja arhanizacyja „Strzelcy". Kali jana ŭ nas paŭstawała, dyk hawaryli, što jana patrebna dziela dabra wioski — dziela jaje „aświety". Tymčasam na praciahu isnawańnia hetaj arhanizacyi pakazałasia susim što inšaje.

Na kožnym pradstaŭleńni, ładžanym „Strzelcami", zaŭsiody wynikali bojki, padčas jakich najbolš dastawałasia samym „stralcom".

Ciapier-ža kamandant „Strzelcaŭ" zadumaŭ załažyć u nas... kramu z harełkaj. Moža i heta patrebna dziela „dabra i aświety" našaj wioski?!

Treba ŭ nas lepš padumać, jak załažyć biblijateku-čytalniu, dzie čałwiek moh-by karysna prawieści wolnuju chwilinu i šmat čaho dobraha nawučycca.

Braty sialanie! Nia budziem kuplać i pić harełki, kab pa našych chatach šyrylisia swarki i niazhody, kab lilisia ślozy žonkaŭ i hałodnych dzietak, lepš woźmiemsia za biełaruskuju knižku i hazetu, jakija nawučać nas, jak paprawić našaje harotnaje žyćcio.

Susied.

Naša pošta

P i n č u k. Atrymali, dziakujem, karystajem i bolš čakajem.

T u t e j š y. Dziakujem, u nastupnym numary skarystajem.

S a w i c k i. Karaspandencyju atrymali, dziakujem, skarystajem Durejku hazety nie pasyłajem, jon nia wypiswaje.

Š p a k. Za karaspandencyju dziakujem, nadrukujem, pišycie bolš. Zajawu pieradali ŭ Prezydyjum B.N.A. Zakładajcie hurtok B.N.A.

S i a b r a. Artykuł Waš wykarystajem u nastupnym numary.

S t a r e j š y. Dziakujem, u nastupnym numary skarystajem.

W y š e m i r s k i J a n. Hrošy atrymali, staryja manety i knižki pieradali ŭ BIHiK.

H u r t k u BIHiK u Ladkoch. Partrety J. Kupały, J. Kolasa i M. Bahdanowiča kaštujuć pa 1 zł. za štuku.

Redaktar Jan Paźniak.
Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2.
Wydawiec A. Šutowič